# РАЗВІЦЦЁ МІЖНАРОДНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА МОЛАДЗІ НА ЭТАПЕ СТАНАЎЛЕННЯ ДЗЯРЖАЎНАЙ МАЛАДЗЁЖНАЙ ПАЛІТЫКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Т. У. Філазаповіч (Мінск)

Дзяржаўная маладзёжная палітыка Рэспублікі Беларусь паклала свой пачатак у 1991 годзе, як прынцыпіяльна новы накірунак дзейнасці органаў дзяржаўнай улады. Гэта сістэма сацыяльна-эканамічных, палітычных, арганізацыйных і прававых мераў, накіраваных на падтрымку маладых грамадзян Рэспублікі Беларусь ва ўзросце да 31 году, якія ажыццяўляюцца дзяржавай для сацыяльнага станаўлення, развіцця моладзі і найбольш поўнай рэаліцацыі яе патэнцыялу ў інтарэсах усяго грамадства. Асноўным нарматыўным дакументам з'яўляецца Закон Рэспублікі Беларусь "Аб агульных пачатках дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі" ад 24.04.1992 году, са зменамі ў 1997 годзе.

Развіццё міжнароднага супрацоўніцтва моладзі з'яўляецца аднам з прыярытэтных накірункаў дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі Рэспублікі Беларусь. Гэта таксама адзін з накірункаў знешнепалітычнай дзейнасці дзяржавы, так як развіццё і ўмацаванне кантактаў моладзі Рэспублікі Беларусь з равеснікамі з замежных краін, стварэнне ўвесь час дзеючага шматфункцыянальнага механізму міжнародных сувязей моладзі, далучэнне да існуючых міжнародных праграм, спрыяе наладжванню цесных двухбаковых сувязей нашай дзяржавы з замежнымі краінамі, і ў цэлым, умацаванню аўтарытэту Рэспублікі Беларусь на міжнароднай арэне.

Сумесныя пратаколы паміж Дэпартаментам па справах моладзі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Цэнтрам маладзёжных абменаў Брытанскага Савету аб выкананні сумесных праграм у галіне маладзёжнай палітыкі падпісываліся кожныя два гады, пачынаючы з 1994 г. Асноўнымі прыярытэтамі супрацоўніцтва з'яўлялася арганізацыя моўных курсаў для спецыялістаў па справах моладзі, азнаямленне з працай дзяржаўных структур і маладзёжных грамадскіх арганізацый у абедзвух краінах, правядзенне адукацыйных семінараў па абмену вопытам у галіне працы з моладдзю і арганізацыі міжнароднага маладзёжнага супрацоўніцтва, садзейнічанне шэрагу абменаў паміж дзяржструктурамі па працы з моладдзю мясцовых выканаўчых органаў, маладзёжнымі арганізацыямі дзвюх краін. Дасягнута дамоўленнасць з Пасольствам Велікабрытаніі аб вызваленні ад спагнання консульскага збору з удзельнікаў маладзёжных абменаў на ўмовах узаемнасці [4, л. 104].

У чэрвені 1994 г. было падпісана Пагадненне паміж Камітэтам па справах моладзі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь і Федэральным міністэрствам па справах жанчын і моладзі ФРГ аб супрацоўніцтве ў пра-

цы з моладдзю [4, л. 104]. На працягу 1995–1998 гг. быў падпісаны шэраг Пратаколаў і з Урадам Французскай рэспублікі.

Адным з накірункаў у межах супрацоўніцтва моладзі з'яўлялася зблiжэнне моладзі Рэспублікі Беларусь і краін СНД: у першую чаргу бліжэйшых да нас суседзей – Расіі і Украіны. 30 чэрвеня 1995 г. паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Расійскай Федэрацыі, а 14 снежня 1995 г. паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Украінай былі заключаны Пагадненні аб супрацоўніцтве ў галіне маладзёжнай палітыкі. З мэтай рэалізацыі вышэйназваных Пагадненняў, дзяржаўнымі структурамі па справах моладзі, маладзёжнымі і дзіцячымі грамадскімі аб'яднаннямі быў здзейснены шэраг сумесных праектаў, накіраваных на пашырэнне і ўмацаванне сувязей з маладзёжнымі, студэнцкімі і дзіцячымі арганізацыямі дзвюх краін [4, л. 102].

У 1995 г. былі падпісаны дамоўленнасці аб супрацоўніцтве ў галіне маладзёжнай палітыкі паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Рэспублікі Малдова, а ў 1997 г. – Урадам Рэспублікі Казахстан [4, л. 103].

Дзяржаўным камітэтам па справах моладзі, Міністэрствам замежных спраў для выканання пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 56 ад 5 лютага 1997 г. "Аб дадатковых мерах па рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь" была створана сумесная камісія па супрацоўніцтву ў галіне міжнародная маладзёжнай палітыкі (узначаліла Шабаліна А.А.). Асноўнымі мэтамі і задачамі камісіі з'яўлялася:

- садзеянне наладжванню далейшых сувязей Дзяржаўнага камітэта па справах моладзі Рэспублікі Беларусь з адпаведнымі дзяржаўнымі органамі іншых краін;
- распрацоўка і падрыхтоўка да падпісання міжурадавых і
- міжведамасных пагадненняў аб супрацоўніцтве ў галіне маладзёжнай палітыкі паміж Рэспублікай Беларусь і іншымі краінамі;
- садзеянне развіццю міжнародных кантактаў маладзёжных грамадскіх аб'яднанняў;
- інфармаванне структур па працы з моладдзю іншых краін пра маладзёжную палітыку, якая праводзілася ў рэспубліцы;
- выпрацоўка далейшых шляхоў і форм супрацоўніцтва з разнастайнымі міжнароднымі арганізацыямі ў галіне маладзёжнай палітыкі [1, л. 24].

Надалей міжнароднае супрацоўніцтва моладзі пачало ажыццяўляцца ў адпаведнасці з Праграмай міжнароднага маладзёжнага супрацоўніцтва і рабочым планам яе рэалізацыі, а таксама Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 2 сакавіка 1998 г. № 92 [2, л. 30].

Рэспубліка Беларусь надае важнае значэнне развіццю адносін з Кітайскай Народнай Рэспублікай. Кітай займае ключавую пазіцыю ва ўсходнем вектары знешней палітыкі Беларусі. Традыцыйна ўсталяванае



Рэпазіторый ВДУ

творчае, сталае, доўгатэрміновае партнёрскае супрацоўніцтва з КНР назіраецца ў розных сферах і накірунках дзейнасці дзвюх краін на розных узроўнях. Важнае значэнне мела наладжванне супрацоўніцтва паміж маладзёжнамі арганізацыямі і структурамі. У 1999 г. у ходзе візіту Старшыні Дзяржаўнага камітэту па справах моладзі Рэспублікі Беларусь Пазняка А.Р. было падпісана Пагадненне аб двухбаковым супрацоўніцтве паміж Дзяржаўным камітэтам па справах моладзі Рэспублікі Беларусь і Усекітайскай арганізацыяй моладзі [4, л. 105].

У кастрычніку 1999 г. быў падпісаны Пратакол сустрэчы па двухбаковаму супрацоўніцтву паміж Дзяржаўным камітэтам па справах моладзі Рэспублікі Беларусь і Камітэтам па справах моладзі пры Урадзе Рэспублікі Таджыкістан, асноўнымі прыярытэтамі якога з'яўляліся абмен звесткамі пра рэалізацыю дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі ў Беларусі і Таджыкістане, садзеянне ў арганізацыі сумесных сустрэч, канферэнцый, семінараў і іншых мерапрыемстваў, якія б спрыялі інтэграцыі моладзі [4, л. 104].

Напрамак краін Прыбалтыкі пакідаў яшчэ шмат перспектыў для пашырэння сувязей. Пакуль традыцыйным заставалася толькі адно мерапрыемства: удзел у Міжнародным маладзёжным лагеры "Бе-Ла-Русь", у якім прымала ўдзел моладзь Беларусі, Латвіі, Расіі.

У 1998–2003 гг. намецілася тэндэнцыя актывізацыі ўдзелу прадстаўнікоў дзяржаўных структур па працы з моладдзю і маладзёжных грамадскіх аб'яднанняў у шматбаковых маладзёжных праектах і праграмах . Так, Рэспубліка Беларусь была прадстаўлена на Канферэнцыях міністраў па справах моладзі еўрапейскіх краін, Еўрапейскім кіруючым камітэце па справах моладзі Савета Еўропы, Клубе міністраў па справах моладзі дзяржаў-удзельніц Садружнасці Незалежных дзяржаў [3, л. 55].

Штогод, з моманту падпісання вышэйадзначаных пагадненняў, прадстаўнікамі дзяржаўных структур, маладзёжных і дзіцячых грамадскіх арганізацый Беларусі, Расіі, Украіны, Малдовы, Казахстана і іншых краін праводзіўся цэлы шэраг праектаў у галіне рэалізацыі міжнароднага маладзёжнага супрацоўніцтва. Разам з тым, улічваючы структурныя змены ва Урадах краін-партнераў, ліквідацыю Дзяржаўнага камітэту па справах моладзі Рэспублікі Беларусь і ўскладаннем функцый правядзення дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі на Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь з утварэннем у яго структуры Дэпартамента па справах моладзі (2001 г.), а таксама абмежаванасць сродкаў на развіццё міжнароднай дзейнасці, падпісанне сумесных пратаколаў аб супрацоўніцтве ў галіне рэалізацыі маладзёжных праектаў і праграм паміж Дэпартаментам па справах моладзі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і дзяржаўнымі структурамі па справах моладзі ўказаных краін пэўны час (2000–2003 гг.) не ажыццяўлялася [4, л. 103].

Рэпазіторый ВДУ

Такім чынам, добра разумеючы адзінства вырашаемых задач па стварэнні умоў для рэалізацыі маладзёжнай палітыкі, ахове правоў і інтарэсаў моладзі, усведамляючы значэнне укладу моладзі ў развіццё ўзаемаразумення і супрацоўніцтва, а таксама прымыючы да ўвагі тое, што на сучасным этапе развіцця грамадства, роля моладзі ў вырашэнні грамадскіх праблем няўхільна ўзрастае, было прынята шэраг пагадненняў паміж Рэспублікай Беларусь і іншымі краінамі ў галіне маладзёжнай палітыкі. Гэта пагадненні з Дзяржаўным камітэтам па справах моладзі Расійскай Федэрацыі, Міністэрствам Украіны па справах моладзі і сямьі, Міністэрствам культуры і адукацыі Рэспублікі Польшча, Урадам Рэспублікі Казахстан, Урадам Кыргызскай Рэспублікі, Урадам Венгерскай Рэспублікі, Дзяржаўным дэпартаментам па справах моладзі Грузіі, Урадам Сірыйскай Арабскай Рэспублікі, КНР, з Італіяй. Міжнароднае маладзёжнае супрацоўніцтва з'яўлялася адным з важных накірункаў працы ў галіне рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі Беларусі, якое ажыццяўлялася ў адпаведнасці з Рэспубліканскай праграмай "Моладзь Беларусі" і Законам Рэспублікі Беларусь "Аб агульных пачатках дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі", а таксама Праграмай міжнароднага маладзёжнага супрацоўніцтва.

1. Ведамасны архіў Міністэрства адукацыі РБ. – Ф. Дэпартамента па справах моладзі Міністэрства адукацыі РБ. Воп. 1. – Спр. 47.
2. Ведамасны архіў Міністэрства адукацыі РБ. – Ф. Дэпартамента па справах моладзі Міністэрства адукацыі РБ. Воп. 1. – Спр. 118.
3. Ведамасны архіў Міністэрства адукацыі РБ. – Ф. Дэпартамента па справах моладзі Міністэрства адукацыі РБ. Воп. 1. – Спр. 139.
4. Ведамасны архіў Міністэрства адукацыі РБ. – Ф. Дэпартамента па справах моладзі Міністэрства адукацыі РБ. Воп. 1. – Спр. 155.

Репозиторий ВГУ